Падтрымай "Вясну" на PATREON

Журналіста-фрылансера Жукоўскага аштрафавалі на 1150 рублёў

11.07.2017 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода слова



Журналіст-фрылансер Кастусь Жукоўскі ў судзе

Суддзя Светлагорскага раённага суду **Руслан Царук** прызнаў гомельскага журналіста-фрылансера **Кастуся Жукоўскага** вінаватым у незаконным вырабе прадукцыі СМІ для тэлеканалу «Белсат». Адміністратыўны працэс адбываўся 10 ліпеня.

У міліцэйскім пратаколе, які склаў старшы ўчастковы інспектар **Крук**, гаворыцца, што відэасюжэт «173 дні да пуску цэлюлёзнага камбінату ў Светлагорску. Жыхары супраць» на польскім спадарожнікавым тэлеканале «Белсат» пра будаўніцтва новага хімічнага прадпрыемства ў Светлагорску выяўлены

падчас маніторынгу СМІ. Супольнае беларуска-кітайскае прадпрыемства па вытворчасці сульфатна-беленай цэлюлозы адносіцца да першай класу небяспекі: у працэсе адбельвання цэлюлозы хлорам утвараюцца атрутныя хімічныя злучэнні.

Судовая пастанова была агучаная ў 17-50: прызнаць вінаватым і пакараць штрафам у памеры 50 базавых велічыняў, што складае 1150 рублёў, паведамляе тэлеканал "Белсат".

> *«Гэта мэтанакіраваны пераслед за маю фрылансерскую дзейнасць*, — лічыць Кастусь Жукоўскі. — *Бо ў відэасюжэце „Белсату“ пра будаўніцтва кітайцамі заводу беленай цэлюлозы ў Светлагорску выкарыстаныя ня толькі мае відэаздымкі, але і трох іншых агенцтваў. Тым ня менш судзілі толькі мяне аднаго».*

Твитнуть









чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ

Рэпрэсаваны "Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску




#ВолюВясне


ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць залежнікамі" – вясняўцы на акцыі ў Вільні

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY